# МАГЧЫМАСЦІ ЭТЫМАЛАГІЧНАГА АНАЛІЗУ Ў ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАХ

***Ашомка М. В.*** *(УА «МДПУ імя І. П. Шамякіна»)*
***Навуковы кіраўнік*** *– А. В. Солахаў, канд. філал. навук, дацэнт*

Школьная праграма не прадугледжвае засваенне ведаў пра этымалагічны разбор і фарміраванне адпаведных лінгвістычных уменняў. Аднак ужыванне этымалагічнага аналізу неабходна ў сучаснай школе для пашырэння слоўнікавага запасу вучняў, для правільнага разумення лексічнага значэння слоў, для змяншэння арфаграфічных памылак.

Этымалагічны аналіз можа праводзіцца ў форме гутаркі.

Напрыклад:

– Які хлебабулачны выраб падобны на палку? (Батон.)

– Правільна. Гэта слова прыйшло да нас з французскай мовы, дзе яно абазначае палку.

Пры знаёмстве з новымі словамі этымалагічны аналіз можа праводзіцца ў некалькі этапаў:

1) тлумачэнне сучаснага лексічнага значэння слова;

2) этымалагічная даведка, якая адлюстроўвае паходжанне слова;

3) узор кароткага запісу этымалагічнай даведкі ў слоўніку;

4) дэманстрацыя малюнкаў з адлюстраваннем таго прадмета, назва якога тлумачыцца, і таго, які лёг у аснову дадзенага слова (гл. змешчаныя ніжэй фотаздымкі).

Напрыклад: *бібліятэка* – установа, якая збірае і захоўвае кнігі для грамадскага карыстання. Слова прыйшло да нас з лацінскай мовы, дзе складалася з дзвюх частак: *біблiён* – кніга, *тэка* – склад, скрыня.

У іншых выпадках прыводзіцца толькі этымалагічная даведка і падбіраюцца роднасныя словы.

Напрыклад, слова *аўтамабіль* прыйшло да нас з французскай мовы. Утворана яно з двух слоў: грэчаскага *аутос* –сам – і лацінскага *мобіліс* – які рухаецца, рухомы. Вось і атрымліваецца: *аўтамабіль* – які рухаецца сам. У беларускай мове цяпер шмат слоў, у якіх ёсць частка *аўто- (аўта-),* напрыклад: *аўтакары, аўтакран, аўтамашына, аўтапагрузчык, аўтатранспарт, аўтобус* і інш.

Экскурсы ў гісторыю развіцця той або іншай моўнай адзінкі выхоўваюць у вучняў увагу да роднага слова, выклікаюць цікавасць да працэсу станаўлення і развіцця лексічных адзінак, садзейнічаюць паглыбленню ведаў пра лексічнае багацце беларускай мовы, дапамагаюць лепш пазнаць мінулае нашага народа.

МГПУ им. И.П.Шамякина